# Крыжаванка лёсу Ігната Мазура

УДК 929Мазур+37.01(476)(092)+008(476)(092)



Вера МІЦКЕВІЧ,
даследчыца жыцця
і творчасці Якуба Коласа

Вера МІЦКЕВІЧ. Крыжаванка лёсу Ігната Мазура. Артыкул прысвечаны грамадскаму дзеячу, настаўніку і журналісту Ігнату Мазуру, які стаяў каля вытокаў стварэння БССР, нацыянальнай педагогікі, меў жыццёвыя і працоўныя стасункі з народным паэтам Беларусі Якубам Коласам.
Ключавыя словы: беларуская дзяржаўнасць, беларуская педагагічная дзейнасць, Ігнат Мазур, Якуб Колас.

Vera MITSKEVICH. Twists and turns of Ignat Mazur's life. The article is dedicated to public figure, teacher and journalist Ignat Mazur who was at ground zero of the BSSR and the national pedagogy, who cooperated and communicated with the People's Poet of Belarus Yakub Kolas.
Keywords: Belarusian statehood, Belarusian pedagogical activity, Ignat Mazur, Yakub Kolas.

Ігнат Мазур нарадзіўся ў 1890 годзе ў сям'і селяніна Мікалая, які меў пяць дзесяцін сенапашні, у невялікай вёсцы Ператокі Нова-Свержанскай воласці Мінскага павета Мінскай губерні (цяпер вёска адносіцца да Старасвержанскага сельсавета Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці). Вёска знаходзіцца за пяць кіламетраў ад г. Стоўбцы і за 82 – ад Мінска. Ператокі вядомы з 1579 года ў складзе ВКЛ, у XVII – першай палове XVIII стагоддзя ў складзе Мірскага графства, уладанне Радзівілаў, з 1793 года – у Расійскай імперыі. У 1890-х гадах у Ператоках было больш за 50 двароў і каля 400 жыхароў (сёння 265 жыхароў), працавала школа, дзейнічаў хлебазапасны магазін *[1]*. Вёска Ператокі не раз была акупіравана ў XX стагоддзі: кайзераўскай Германіяй, польскімі войскамі, нямецка-фашысцкімі захопнікамі…

Як і большасць сялянскіх дзяцей, Ігнат Мазур пачатковую адукацыю атрымаў у двухкласным вучылішчы-школцы, у 1910 годзе скончыў вядомую Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, дзе раней вучыўся і Канстанцін Міцкевіч (Якуб Колас).

Пасля заканчэння семінарыі І. Мазур працаваў настаўнікам у школах Барысаўскага павета Мінскай губерні ў вёсках Гібайлавічы (сучасная назва – в. Знаменская Крупскага раёна) і Сморкі (в. Зорычы Барысаўскага раёна).

З пачатку Першай сусветнай вайны І. Мазур быў прызваны на ваенную службу ў царскую армію. З 20 ліпеня 1914 года служыў радавым пры шпіталі.

1 снежня 1916 года скончыў шасцімесячныя курсы Віленскага ваеннага вучылішча, якое на той час знаходзілася ў Палтаве, атрымаў чын прапаршчыка і камандаваў узводам пяхоты. У 1917 годзе І. Мазур – начальнік гарнізона ў Царыцыне (сучасны Валгаград) – адмовіўся выконваць загад Часовага ўрада пасылаць салдат на фронт, за што яго пад

## ПРА АЎТАРА

МІЦКЕВІЧ Вера Даніілаўна.

Нарадзілася ў Мінску. Скончыла гандлёва-эканамічны факультэт Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В.В. Куйбышава (цяпер БДЭУ, 1982).

У 1982–1991 гадах працавала ў гандлёвых арганізацыях і навучальных установах, Гандлёва-прамысловай палаце БССР. У 1991–2001 гадах – навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. З 2001 па 2005 год – эксперт БРФ «Узаемаразуменне і прымірэнне». У 2006–2016 гадах – бібліятэкар 1-й катэгорыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. З 2016 года – навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Аўтар больш за 70 публікацый, кнігі «Якуб Колас – пясняр зямлі і неба Беларусі» (2016), укладальніца кніг.

Сфера навуковых інтарэсаў: малавядомыя старонкі жыцця і творчасці Якуба Коласа, даследаванне акружэння Песняра; прысутнасць прадстаўнікоў роду фон Гоер на беларускіх землях у XIX–XX стагоддзях.

канвоем адправілі на Румынскі фронт. У Румынію на вайну трапіла шмат выхадцаў з Беларусі, сярод іх былі і Якуб Колас, і Кандрат Крапіва.

У ліхія гады Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны куды толькі не закідваў лёс Ігната Мазура! У студзені–красавіку 1918 года ён настаўнічаў у родных мясцінах, у Навасвержанскай двухкласнай школе. З вясны 1918 года І. Мазур знаходзіўся ў Маскве, дзе ў жніўні яго прынялі ў сябры РКП(б) Хамоўніцкай партыйнай арганізацыяй. Амаль паўгода, да студзеня 1919 года, ён быў школьным інструктарам у Белнацкаме (Беларускім нацыянальным камісарыяце), а ў студзені–сакавіку 1919 года – яго загадчыкам.

Белнацкам з'яўляўся аддзелам Наркамата па справах нацыянальнасцей РСФСР у 1918–1919 гадах, які ўзначальваў І. Сталін. Белнацкам створаны ў лютым 1918 года ў Петраградзе, а ўжо ў сакавіку пераехаў у Маскву. Першым кіраўніком гэтай арганізацыі быў Аляксандр Чарвякоў, пасля Зміцер Жылуновіч. З Жылуновічам І. Мазур пасябраваў на ўсё жыццё, такое кароткае для пісьменніка Цішкі Гартнага (З. Жылуновіча). Белнацкам працаваў у цеснай сувязі з беларускай секцыяй РКП(б), куды ўваходзіў І. Мазур. У ліпені 1918 года Белнацкам правёў у Маскве нараду беларускіх настаўнікаў, дзе выступіла з дакладам Надзея Канстанцінаўна Крупская, якая пазней часта наведвала Акадэмію сацыяльнага выхавання, там вучыўся І. Мазур. У 1920–1930-я гады І. Мазур, бываючы ў Маскве, заходзіў да ўдавы Леніна параіцца па розных пытаннях *[2]*.

Ігнат Мазур займаў актыўную пазіцыю ў вызначальныя гады станаўлення беларускай дзяржаўнасці. У верасні 1918 года ён удзельнічаў у Надзвычайнай нарадзе актыўных беларусаў Масквы *[3]*, у аб'яднаным экстранным пасяджэнні сяброў калегіі Белнацкама, прадстаўнікоў Цэнтральнага бюро камуністычных секцый і камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) напрыканцы снежня 1918 года ў Маскве, дзе быў вылучаны кандыдатам на наркама земляробства будучай беларускай рэспублікі *[4, с. 119]*. У той час І. Мазур працаваў загадчыкам пазашкольнага пададдзела культасветаддзела Белнацкама. Гэты факт апісаны на старонках рамана Генрыха Далідовіча «Свой дом».

Як вядома, 1 студзеня 1919 года была абвешчана ССРБ – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусія. 4 студзеня у сувязі з гэтай гістарычнай падзеяй прывітальны ліст ураду новастворанай рэспублікі падпісаў старшыня Маскоўскай секцыі беларусаў-камуністаў І. Мазур *[4, с. 127]*.

У чэрвені 1919 года І. Мазур быў прызваны ў рады Чырвонай арміі і праз месяц прызначаны камбатам у 369-ы стралковы полк 41-й стралковай дывізіі на Паўднёвы фронт, удзельнічаў у баях у Харкаўскай і Курскай губернях. 31 жніўня атрымаў раненне нагі і праз некаторы час быў звольнены па стане здароўя камісіяй пры штабе Магілёўскай ваеннай акругі *[5, арк. 25]*.

Далей – вучоба ў Маскве, у Акадэміі сацыяльнага выхавання (лістапад 1919 – ліпень 1923), дзе І. Мазур вывучаў гісторыю партыі, палітэканомію, рэвалюцыйны рух, гістмат *[5, арк. 29]*, і актыўная праца па партыйнай і грамадскай лініях у акадэміі сябрам бюро партыі РКП(б), упаўнаважаным ад студэнцтва па сацыяльным забеспячэнні. Падчас вучобы І. Мазур узяў грамадзянскі шлюб, што было ў 1920-я гады модным, з навучэнкай акадэміі Любоўю Канстанцінаўнай Паповай. У Маскве ў 1921 годзе ў іх нарадзіўся першынец – сын Усевалад. Пасля вучобы І. Мазуру прапаноўвалі застацца працаваць у акадэміі, але ўсімі думкамі і жаданнямі ён імкнуўся ў родную Беларусь.

У Мінску Ігнат Мікалаевіч у кастрычніку 1923 года быў прызначаны дырэктарам толькі што створанай пры Белпедтэхнікуме Вопытна-паказальнай школы (пазней – Цэнтральная даследчая школа), яго жонка стала працаваць выкладчыцай там жа. Пражывалі Мазуры на вуліцы Савецкай, 97 *[6]*.

У Белпедтэхнікуме ў 1920-я гады працаваў Якуб Колас і, безумоўна, ён спрыяў адкрыццю такой эксперыментальнай школы і камплектаванню яе прафесійнымі кадрамі, спрыяў вяртанню беларускіх настаўнікаў на радзіму. Сярод першых выкладчыкаў Вопытна-паказальнай школы былі педагогі Іван Іовіч Пратасевіч (1889–1969), Іван Карлавіч Самковіч (1889–1938 ці 1939), Сцяпан Васільевіч Касмовіч, Канстанцін Іванавіч Шапялевіч (1889–1976), Антон Іванавіч Касабуцкі, Мікалай Мікалаевіч Пігулеўскі (1897–1967), Марта Іванаўна Калінічэнка (1894–1961), Лука Савіч Гарбацэвіч (1882–1940). М. Калінічэнка пазней вучыла сярэдняга сына Якуба Коласа Георгія (Юрку), калі школа была пераўтворана ў 21-ю НСШ. З Л. Гарбацэвічам пясняр быў знаёмы і сябраваў яшчэ з семінарскіх гадоў *[7]*, а з К. Шапялевічам пазнаёміўся напрыканцы лета 1914 года падчас непрацяглай вайсковай службы ў Серпухоўскім палку ў Мінску.

Праз два гады пасля адкрыцця Цэнтральная даследчая школа стала самастойнай установай, дзе настаўнікі распрацоўвалі новыя формы і методыкі навучання, актыўна друкаваліся ў часопісах; у школе праходзілі практыку студэнты.

Жонка І. Мазура – Любоў Канстанцінаўна Папова (1892–1962, заставалася на сваім дзявочым прозвішчы) – руская па нацыянальнасці, ураджэнка г. Малмыж Сарапульскага павета Вяцкай губерні, падчас Першай сусветнай вайны

была сястрой міласэрнасці санітарнага цягніка. У Мінску працавала таксама ў дзіцячым садку, дырэктарам рабфака Політэхнічнага інстытута, перад Вялікай Айчыннай вайной была дырэктарам 47-й школы на вул. Свярдлова. Яна добра авалодала беларускай мовай, любіла чытаць, бываць у тэатрах, на канцэртах, займалася духоўным выхаваннем дзяцей, сына Усевалада і дачкі Іны.

У лютым 1925 года І. Мазур перайшоў на працу ў Народны камісарыят асветы, дзе ўзначаліў Галоўнае ўпраўленне сацыяльнага выхавання (Галоўсацвых), быў старшым інспектарам школ і ВНУ, з'яўляўся сябрам Гарсавета. У 1925–1927 гадах І. Мазур – правадзейны член Інбелкульта, працаваў у педагагічнай і школьнай секцыях установы, а таксама ў Цэнтральным бюро юных піянераў.

У сярэдзіне 1920-х гадоў Ігнат Мікалаевіч шчыраваў на педагагічнай ніве: пісаў школьныя падручнікі, артыкулы ў часопіс «Асвета» (1924–1929), дзе на грамадскіх пачатках амаль чатыры гады выконваў абавязкі адказнага рэдактара. І. Мазурам і настаўнікамі доследнай школы друкаваліся распрацаваныя комплексы заняткаў, схемы ў табліцах, напрыклад «Удзел у акружаючым жыцці», «Хатнія жывёлы», «Падрахунак вакацый», «Чалавек» і інш.

Кніга для другога года навучання па комплекснай сістэме «Чырвоная змена», напісаная І. Мазурам разам з М. Калінічэнка, а таксама чытанка для трэцяга года навучання «Чырвоная Беларусь» у суаўтарстве з К. Шапялевічам вытрымалі не адно выданне, што сведчыла пра іх запатрабаванасць у гады станаўлення нацыянальнай адукацыі.

Гэта былі напружаныя, насычаныя справамі і ў той жа час самыя шчаслівыя гады жыцця І. Мазура.

Сям'я Мазураў па прыездзе ў Мінск пражывала ў будынку школы, а паколькі Ігнат Мікалаевіч ужо працаваў у Наркамасветы, паўстала пытанне жытла. Але куды перабірацца? Сваёй жылплошчы не было, наймаць кватэру – дорага, а службовай не забяспечвалі. І тут нечаканую прапанову І. Мазуру зрабіў Якуб Колас. Ён запрасіў яго сям'ю ў свой нядаўна пабудаваны двухпавярховы дом, што месціўся на Вайсковым завулку каля самага парку «Прафінтэрн» (цяпер тэрыторыя парку імя М. Горкага). Канстанцін Міхайлавіч і Ігнат Мікалаевіч былі землякамі і знаёмыя па настаўніцкай працы яшчэ з дарэвалюцыйных часоў. Жылі Мазуры ў доме народнага паэта восем гадоў (1929–1937). Сям'я Мазураў займала два вялікія пакоі з кухняй і зашклёнай верандай на першым паверсе Коласавага дома і ім было няёмка не плаціць грошай, на што Якуб Колас адказаў, што яму аплаты не трэба і калі ў І. Мазура ёсць жаданне, няхай ён нейкую суму грошай уносіць у фонд дапамогі дзецям.

Усевалад Мазур пражыў у доме Якуба Коласа з 8 да 16 гадоў і пакінуў цікавыя ўспаміны пра гэты час, асабліва неацэнныя як ва ўспрыманні Якуба Коласа ў хатняй сямейнай атмасферы, стасункаў песняра з роднымі і знаёмымі, так і ў апісанні абстаноўкі ў доме, розных дэталяў. Хлопчыка «рабочы кабінет <…> заўсёды здзіўляў нязменна строгім парадкам на пісьмовым стале. Кожны раз на адным і тым жа месцы – стосік чыстай паперы, ручка, сцізорык і келіх з добра падвостранымі алоўкамі» *[8, с. 181]*. А яшчэ памяць дзесяцігадовага юнака захавала ўспаміны пра пяшчотны догляд жонкі паэта Марыі Дзмітрыеўны, калі ён зімой 1931 года доўга хварэў на плеўрыт; пра майстра на ўсялякія штукі і гульні, таварыскага і вясёлага сярэдняга сына пісьменніка Георгія – Юрку, як звалі яго ў сям'і; пра старэйшага сына Данілу, аднаго з найлепшых студэнтаў хімфака БДУ, які быў улюбёны ў хімію і часта праводзіў свае хімічныя доследы ў хаце, нават варыў мыла для патрэб сям'і і кватарантаў.

**М. Купава. Дом Якуба Коласа ў Менску. 1927–1941. Літаграфія, 1986 год**
Крыніца: фонды Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.




Наступілі сумнавядомыя 1930-я гады. І. Мазур з 1931 года займеў яшчэ адну пасаду – старшага кансультанта сацыяльна-культурнай групы Упраўлення справамі СНК БССР. У тым жа годзе, як і многіх партыйных работнікаў, І. Мазура пасылалі ў беларускія вёскі праводзіць калектывізацыю і раскулачванне, што зрабіла на яго вельмі прыкрае ўражанне, і па прыездзе ў Мінск ён цяжка захварэў. Пачалі адбывацца змены



**Сям'я Мазураў:**
**Ігнат Мікалаевіч, Іна, Усевалад, Любоў Канстанцінаўна. 1946 год**
Крыніца: фонды Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

не ў лепшы бок і ў іншых сферах, напрыклад у друку, шуканне «ворагаў народа», знішчэнне таленавітых, самаадданых працы і рэвалюцыйным ідэалам людзей.

На партыйным сходзе 1936 года І. Мазур быў выключаны з КП(б)Б за кнігі – школьныя падручнікі, за тое, што аўтарамі была дадзена праўдзівая інфармацыя пра рост захворванняў на сухоты і смяротнасць ад хваробы ў рэспубліцы, адшукалі ў падручніках і іншыя «варожыя» тэксты. Данос на І. Мазура ў форме закрытай рэцэнзіі на падручнік «Чырвоная Беларусь» напісаў у чэрвені 1936 года Васіль Барысенка, у той час дэкан пэдінстытута. Аўтараў падручніка звольнілі з працы, І. Мазура – з навукова-даследчага інстытута школьнай педагогікі, беспартыйнага К. Шапялевіча – з пасады завуча школы. Больш пацярпела М. Калінічэнка, яна была асуджана ў 1939 годзе за «ўдзел у контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» і «шкодніцкую дзейнасць у сістэме народнай адукацыі» да пяці гадоў папраўча-працоўных лагераў.

Ігнату Мікалаевічу з дапамогай сяброў удалося ўладкавацца на працу ў школу настаўнікам. Кожны дзень ён чакаў арышту. На думку яго сына, І. Мазур значыўся ў спісе ненадзейных асоб, у выпадку пачатку вайны ці іншых надзвычайных сітуацый на гэтых людзей распаўсюджвалася дырэктыва арышту. Так і адбылося. У ноч з 22 на 23 чэрвеня 1941 года І. Мазура арыштавалі (з 1937 года сям'я Мазураў пражывала на вул. Свярдлова) і адвялі ў турму на вул. Валадарскага, дзе такіх «ненадзейных» было ўжо шмат. Групу арыштаваных, у якой быў і І. Мазур, днём канваіравалі па Магілёўскай шашы, вялі на расстрэл. Але каля Чырвонага ўрочышча (цяпер раён Мінскага аўтамабільнага завода) начальнік канвою, савецкі камандзір, адпусціў арыштантаў, не выканаў ганебнага загаду. Застаецца толькі гадаць, чаму ён так паступіў, чым кіраваўся. Пасля вайны І. Мазур часта ўспамінаў камандзіра-выратавальніка, шкадаваў, што не ведаў яго імя і прозвішча, каб адшукаць і пакланіцца за свой другі дзень народзінаў.

Па парадзе камандзіра І. Мазур падаўся на ўсход і нарэшце апынуўся ў г. Мічурынску Тамбоўскай вобласці. Адтуль у лютым 1942 года ён даслаў Якубу Коласу ў Ташкент тэрміновую тэлеграму з просьбай даць адрас дачкі Іны, бо нічога не ведаў пра дзяцей і жонку, дзе яны апынуліся падчас фашысцкай навалы *[9]*. У Мічурынску, які знаходзіўся блізка ад лініі фронту зімой 1941–1942 гадоў, за яго паручыўся добры знаёмы з Мінска, супрацоўнік ваеннага штаба, і І. Мазура ўзялі ў дывізію, якая фарміравалася для адпраўкі на фронт.

Ігнат Мікалаевіч Мазур прайшоў дарогамі Вялікай Айчыннай вайны, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За Перамогу над Германіяй». У радах Камуністычнай партыі быў адноўлены толькі ў 1955 годзе.

Любоў Канстанцінаўна заставалася ў акупіраваным Мінску, была сувязной 18-й партызанскай брыгады імя М. Фрунзэ.

Усевалад Ігнацьевіч Мазур (1921–2005) перад вайной праходзіў тэрміновую вайсковую службу на Каўказе на мяжы з Турцыяй у пагранвайсках, адтуль быў адпраўлены на фронт танкістам, ваяваў, сустрэў Перамогу ў Вене. Пасля вайны скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.В. Куйбышава (1950), працаваў у Беларускім політэхнічным інстытуце (1953–1959), у Мінскай ВПШ (1959–1981) дацэнтам кафедры палітэканоміі; кандыдат эканамічных навук, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, ветэран вайны і працы.

Дачка І. Мазура Іна ў першыя дні вайны знаходзілася на аздараўленні на Гомельшчыне, адкуль была эвакуіравана ў дзіцячы дом у Данбасе. Пасля апынулася ў Казахстане, далей – у далёкіх родзічаў у Іркуцку, дзе скончыла школу і паступіла ў Іркуцкі ўніверсітэт. Восенню 1944 года вярнулася ў Мінск, працягвала вучобу на філфаку ў БДУ (1944–1948). Як і многія мінчукі, удзельнічала ў адбудоўванні сталіцы. Працавала ў рэдакцыях «Савецкага селяніна», «Калгаснай праўды», «Савецкай Беларусіі», «Работніцы і сялянкі», пазней у БСЭ імя П. Броўкі. Іна Ігнатаўна Смірнова (1925–2018) была сябрам рэспубліканскага Саюза журналістаў.

Сапраўдным цудам для сям'і Мазураў стала тое, што ўсе яны засталіся жывыя, унеслі свой неацэнны ўклад у перамогу над фашызмам і ўз'ядналіся пасля вайны ў Мінску.

Ігнату Мікалаевічу пашчасціла дачакацца і паняньчыць чацвярых унукаў, у памяці якіх ён застаўся лагодным, пяшчотным дзядулем.

У 1950-я гады І. Мазур захварэў на сухоты. Яго сэрца перастала біцца ў 1958 годзе.

Пакручастыя дарогі лёсу Ігната Мазура і яго сям'і адлюстроўваюць эпоху станаўлення беларускай рэспублікі ў першай палове XX стагоддзя.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.02.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Гарады і вёскі Беларусі: энцыкл.: у 10 т. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літар.; пад навук. рэд. А.І. Лакоткі. – Мінск: Белар. энцыкл. імя П. Броўкі, 2004–2021. – Т.8. Мінская вобл. – Кн. V. – 2014. – С. 138–139.
2. Мазур, У. З верай у праўду / У. Мазур // Маладосць. – 1990. – № 12. – С. 126–138.
3. Скалабан, В. «Для адстойвання інтарэсаў Айчыны…»: невядомы дакумент 1918 года па гісторыі беларускай дзяржаўнасці / В. Скалабан // Беларуская думка. – 2010. – № 12. – С. 70–75.
4. Обретение республики: история образования Белорусской ССР и создания Компартии Белоруссии в документах / Институт истории партии при ЦК КПБ; публ. Н.С. Сташкевича, М.Ф. Шумейко, А.Н. Гесь // Нёман. – 1989. – № 1. – С. 113–128.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 3. Адз. Зах. 306.
6. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 3. Адз. зах. 255. Арк. 146.
7. Міцкевіч, В. Жыццёвы шлях педагога-адраджэнца Лукі Гарбацэвіча, сябра Якуба Коласа / В. Міцкевіч // Роднае слова. – 2021. – № 5. – С. 30–34.
8. Мазур, У. Восем гадоў у доме Якуба Коласа / У. Мазур // Полымя. – 1986. – № 3. – С. 180–183.
9. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. – Асабісты архіў. – Воп. 82. КП14101/Аа2272.


## АД РЭДАКЦЫІ

*Аўтар прысвячае свой матэрыял краязнаўцу, журналісту Сяргею Аляксандравічу Галоўку, былому супрацоўніку рэдакцыі «Беларускай думкі», які планаваў напісаць артыкул пра свайго земляка – грамадскага дзеяча, настаўніка і журналіста І.М. Мазура. Але, на жаль, не паспеў. Артыкул «Крыжаванка лёсу Ігната Мазура» – даніна павагі і памяці пра славутых людзей Бацькаўшчыны. Аўтар выказвае падзяку за дапамогу ў пошуках інфармацыі ўнукам Ігната Мазура – Уладзіміру Мазуру, Людміле Запольскай, Таццяне Смірновай-Лапацінай, а таксама супрацоўнікам Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.*